**480 гадоў таму (1539)** упершыню ўпамінаецца мястэчка Пяршаі.
**440 гадоў таму (1579)** упершыню ў гістарычных крыніцах Ракаў называецца мястэчкам.
**225 гадоў таму (1794)** у Польшчы, Беларусі, Літве пачалося паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі.
**175 гадоў таму (1844)** у в. Багданава пабудаваны драўляны Міхайлаўскі касцёл – помнік драўлянага дойлідства.
**155 гадоў таму (1864)** заснавана Валожынскае народнае вучылішча.
**150 гадоў таму (1869)** у в. Пяршаі заснавана народнае аднакласнае вучылішча.
**115 гадоў таму (1904)** нарадзіўся Паныш Антон Станіслававіч – дырэктар СШ № 1 Валожына, узнагароджаны ордэнам Леніна.
**115 гадоў таму (1904)** у мястэчку Івянец з'явілася першае фотаатэльё, права адкрыць якое атрымала Брайна Дамская – ураджэнка Івянца, глуханямая ад нараджэння. Праз некалькі гадоў ёй быў дадзены дазвол на фатаграфаванне не толькі ў Івянцы, але і ва ўсёй Мінскай губерні.
**100 гадоў таму (1919)** сяляне вёсак Вялікія Крывічы, Залессе, Крычаўцы арганізавалі першую ў раёне камуну і зацвердзілі яе статут. Камуна дзейнічала да 1920 года.
**95 гадоў таму (1924)** у Валожыне арганізаваны падпольны райкам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, які кіраваў рэвалюцыйным і нацыянальна-вызваленчым рухам працоўных горада і павета ў 1920-1939 гадах.
**80 гадоў таму (1939)** у Івянцы на базе ганчарнага промыслу арганізавана арцель, якая ў 1960 годзе пераўтворана ў фабрыку мастацкай керамікі і вышыўкі.
**75 гадоў таму (1944)** аднавіла дзейнасць Валожынская МТС.
**50 гадоў таму (1969)** пабудаваны будынак фабрыкі мастацкай керамікі ў Івянцы.
**35 гадоў таму (1984)** зацверджаны акт уводу ў эксплуатацыю будынка бальніцы ў в. Вішнева.
**35 гадоў таму (1984)** з мэтай увекавечання памяці беларускага пісьменніка В. І. Дуніна-Марцінкевіча на месцы яго былой сядзібы ў в. Малая Люцінка ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

# КАЛЯНДАР
## знамянальных і памятных дат Валожынскага раёна на 2019 год

### СТУДЗЕНЬ

**70 гадоў таму (04.01.1949)** у в. Брылькі арганізаваны калгас "17 верасня".

**75 гадоў таму (07.01.1944)** у в. Лоск нарадзілася Паўлюкевіч Аляксандра Андрэеўна, узнагароджаная ордэнам Леніна за работу ў сельскай гаспадарцы.

**80 гадоў таму (17.01.1939)** нарадзілася Гіль Марыя Якаўлеўна – з 1969 года галоўны аграном калгаса імя Чапаева (ААТ "Лоск"), узнагароджаная ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага сцяга.

### САКАВІК

**70 гадоў таму (03.03.1949)** у Валожыне праходзіў I раённы з'езд калгаснікаў.

### КРАСАВІК

**90 гадоў таму (26.04.1929)** выйшаў загад Савета Міністраў Польшчы № 308 "Аб залічэнні сяла Валожын Валожынскага павета ў лік гарадоў".

### МАЙ

**70 гадоў таму (10.05.1949)** у в. Забрэззе арганізаваны калгас імя Куйбышава.

**70 гадоў таму (25.05.1949)** у в. Пугачы Залескага сельсавета арганізаваны калгас "Бальшавік".

### ЧЭРВЕНЬ

**80 гадоў таму (10.06.1939)** у в. Лінкі нарадзіўся Чэрня Фёдар Фёдаравіч – філолаг, працаваў рэдактарам на беларускім радыё, у выдавецтве "Беларусь", з 1972 года да канца жыцця – старшы рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура". Аўтар многіх кніг.

**75 гадоў таму (23.06.1944)** пачалася аперацыя па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў "Баграціён", якая працягвалася да 29 жніўня 1944 года. У ходзе аперацыі былі разгромлены галоўныя сілы групы фашысцкіх армій "Цэнтр", вызвалена Беларусь.

### ЛІПЕНЬ

**75 гадоў таму (04.07.1944)** ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вызвалены Ракаў.

**75 гадоў таму (05.07.1944)** войскамі 3-га Беларускага фронта ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вызвалены Валожын.

**75 гадоў таму (10.07.1944)** аднавілі дзейнасць раённая бальніца і райпрамкамбінат.

**75 гадоў таму (15.07.1944)** у Валожыне аднавілі дзейнасць рэдакцыя раённай газеты "Іскра" і друкарня.

**90 гадоў таму (21.07.1929)** у в. Сакаўшчына нарадзіўся Каваленка Віктар Антонавіч – крытык, літаратуразнаўца, празаік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1962), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1981), акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук (1994), дырэктар Інстытута літаратуры імя Я. Купалы (з 1982), доктар філалагічных навук (1978). Лаўрэат дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа (1980) і літаратурнай прэміі Саюза пісьменнікаў СССР (1976), аўтар манаграфій і рамана "Падвышанае неба".

### ЖНІВЕНЬ

**75 гадоў таму (01.08.1944)** у былым маёнтку Шапавалы арганізавана машынна-трактарная станцыя, на базе якой было створана адно з буйнейшых прадпрыемстваў раёна – Валожынская райаграпрамтэхніка.

**70 гадоў таму (04.08.1949)** у в. Пяршаі арганізаваны калгас імя К. Маркса.

**75 гадоў таму (06.08.1944)** на базе маёнтка Чэхаўшчына аднаўлены дзіцячы дом № 1, загадчыкам якога прызначаны Іваноў Сяргей Якаўлевіч.

**75 гадоў таму (22.08.1944)** пачаў вытворчую дзейнасць Валожынскі маслазавод.

**75 гадоў таму (28.08.1944)** у Валожыне адкрылася раённая ашчадная каса.

### ВЕРАСЕНЬ

**80 гадоў таму (17.09.1939)** адбылося аб'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

### КАСТРЫЧНІК

**80 гадоў таму (10.10.1939)** заснавана Валожынская раённая газета "Працоўная слава".

**70 гадоў таму (14.10.1949)** у в. Філіпіняты арганізаваны калгас "Перамога".

**70 гадоў таму (26.10.1949)** у Валожыне адкрылася гарадская бібліятэка.

### ЛІСТАПАД

**70 гадоў таму (14.11.1949)** арганізавана Вішнеўская МТС.

**75 гадоў таму (1944)** прынята рашэнне аб адкрыцці ў раёне шавецкай арцелі "Кастрычнік" – адной з першых пасля вызвалення Валожына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

### СНЕЖАНЬ

**75 гадоў таму (1944)** у мястэчку Ракаў адкрылася сямігадовая школа.

**30 гадоў таму (1989)** адчынілі дзверы новы будынак паліклінікі і бальніцы ў Валожыне.

**30 гадоў таму (1989)** першых вучняў прыняла гімназія № 1 Валожына.

**30 гадоў таму (1989)** пабудаваны будынак раённай пракуратуры па вуліцы Савецкай у Валожыне.

**80 гадоў таму (05.12.1939)** у в. Канюшаўшчына нарадзіўся Поль Міхаіл Браніслававіч: з 1967 года – дырэктар саўгаса "Падбярэззе", з ліпеня 1982 года – дырэктар саўгаса Ракаўскі. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга і медалямі.

**70 гадоў таму (08.12.1949)** у в. Пральнікі арганізаваны калгас "Верны шлях", у в. Суднікі – калгас "Камсамолец".

**80 гадоў таму (20.12.1939)** утвораны Валожынскі лясгас.

**50 гадоў таму (30.12.1969)** на базе санітарна-эпідэміялагічнага аддзела Валожынскай райбальніцы створана раённая санітарна-эпідэміялагічная станцыя.